**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**
**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за жнівень 2023 г.**

**<u>Мерапрыемствы ў рамках раённага конкурсу «Объединить, заинтересовать, увлечь»</u>**

**У жніўні ў публічных бібліятэках ДУК працягнуўся раённы конкурс летняга чытання «Объединить, заинтересовать, увлечь». У рамках конкурсу бібліятэкі праводзілі мерапрыемства для дзяцей і падлеткаў.**

**6 жніўня**

Падчас правядзення квэст-гульні «Найди малыша Динозавра» вядучая распавяла аб навуцы «Палеанталогія». Для падрабязнага пазнання пра дыназаўраў у праграму ўвайшлі наступныя гульні: «Прогуляйся по следам динозавров», «Диноостров», «Найди динозавра». На кожным этапе правільна выкананага задання дзеці знаходзілі літары, з якіх складалі наступнае заданне, разгадвалі рэбусы і крыжаванкі. Усе ўдзельнікі квэст-гульні атрымалі салодкія прызы.

Гарадзецкі філіял, 23 чал.

**15 жніўня**

Бібліятэка правяла свята чытацкіх задавальненняў «Книги в летнем рюкзачке». Дзеці знаёміліся з новымі кнігамі, дзяляліся інфармацыяй з сябрамі пра цікавыя кнігі, успаміналі прыказкі і прымаўкі, у якіх адлюстравана роля кнігі ў жыцці людзей, адказвалі на пытанні літаратурнай віктарыны «Золото добывают из земли, а знания из книги», ўдзельнічалі ў гульнях «Крестики-нолики», «Хоровод сказок», «Летние рифмы». У завяршэнне свята бібліятэкар правяла агляд дзіцячых кніг «Весь мир от А до Я откроет книжная страна».

Тэвельская ПБ, 15 чал.

**18 жніўня**

На выступленні лялечнага кружка «Петрушка» навучэнцы малодшых класаў, іх бацькі і бабулі прагледзелі казку «Как лиса волка судила» а таксама паўдзельнічалі ў віктарынах «Вспомни сказочных героев», «Смешной вопрос», «Приметы солнечного лета». Лепшыя чытачы і актыўныя ўдзельнікі ўзнагароджаны граматамі і салодкімі прызамі.

Лукская ПБ, 23 чал.

**22 жніўня**

Гадзіна летняга адпачынку «Чытаем, гуляем і адпачываем разам» праходзіла на свежым паветры. Дзяці гулялі ў інтэлектуальныя гульні, адгадвалі загадкі і прымалі актыўны ўдзел у выразным чытанні урыўкаў з твораў дзіцячай літаратуры. Пераможцы: Леўчук Аня, Нікуліна Сафія і Канцэвіч Арцём атрымалі салодкія пачастункі.

Хідрынская ПБ, 23 чал.

**19 жніўня**

Работнікі бібліятэкі і Дома культуры правялі пазнавальна-гульнявую праграму «Три Спаса августа». Дзецям расказалі аб мядовым, яблычным і арэхавым Спасе, аб традыцыях, звычаях і народных прыметах, звязаных з імі. На мерапрыемстве прысутнічаў настаяцель Чаравачыцкай царквы айцец Аляксій. Дзеці ўдзельнічалі ў вясёлых конкурсах і віктарынах «Наполни корзину», «Эх Яблочко», «Урожай», у конкурсе малюнка «Натюрморт».

Батчынская ПБ, 21 чел.

## Іншыя мерапрыемствы

**17 жніўня**

Праведзены абласны турнір па сканвардынгу сярод падапечных тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Брэсцкай вобласці ў рамках рэалізацыі мерапрыемстваў Нацыянальнай стратэгіі «Актыўнае даўгалецце – 2023» і мерапрыемстваў прымеркаваных да Года міру і стварэння. У рамках турніру арганізавана правядзенне трох іграваых выпрабаванняў (тураў) па ступені нарастання складанасці сканвордаў. Удзельнікі, якія занялі прызавыя месцы, узнагароджаны дыпломамі і памятнымі прызамі, прадстаўленымі ДУ «Кобрынскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».

ЦРБ, 42 чал.

**13 жніўня**

Падчас правядзення пасяджэння клуба «Залатыя россыпы» этнаграфічнага падарожжа «Живут на земле обычаи» бібліятэкар расказала пра традыцыі і абрады народнага праваслаўнага свята. Удзельнікі ўзгадвалі прыказкі і прымаўкі аб яблыках і Яблычным Спасе, адгадвалі загадкі, прымалі ўдзел у конкурсе «Определи на ощупь», прагледзелі відэапрэзентацыю «Три Спаса – три запаса». Кіраўнік гуртка ОСРАІ і ДПГПВ пры Кобрынскім ТЦСАН Дзмітрый Чаплюн правёў віктарыну «Что Великий Спас нам с тобой припас?», павіншаваў імяніннікаў і ўзнагародзіў дыпломам аматарскае аб'яднанне «Залатыя россыпы». Упрыгожваннем свята сталі песні ў выкананні работнікаў Дзівінскага цэнтру культуры і вольнага часу.

Дзівінская ПБ, 18 чал.

**20 жніўня**

Бібліятэка прыняла актыўны ўдзел у юбілейным свяце вёскі Стрыгава «Зямля бацькоў, жыцця крыніца», размясціўшыся на пляцоўцы «Я люблю читать». Найбольшым попытам у гасцей свята карысталася выстава краязнаўчых кніг «Родным краем ганаруся». Каля кніжна-ілюстрацыйнай выставы для маленькіх наведвальнікаў быў гульнявы стол з гульнятэкай. Жадаючыя мелі магчымасць зладзіць займальную фотасесію з героямі А. Ліндгрэн «Пеппи длинныйчулок» і Н. Носава «Приключения Незнайки». Выстава малюнкаў «Люблю тебя, моя деревня!» радавала гасцей свята. Прысутныя на свяце мацавалі сцікеры з пажаданнямі на «дрэве пажаданняў».

Лепшыя чытачы сярод дзяцей ўзнагароджаны медалямі «Самый активный читатель», «За тягу к чтению», «Лидер чтения», «Лучший читатель детских книг».

Стрыгаўская ПБ

## <u>Выдавецкая дзейнасць</u>

**9 жніўня**

Бібліёграфы цэнтральнай раённай бібліятэкі прапануюць азнаёміцца з інфармацыйна-прававым бюлетэнем «Молодые специалисты: статус, гарантии, компенсации», распрацаваным у рамках ПЦПІ. Уключаны пералік нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць механізм працоўных адносін маладых службоўцаў, маладых адмыслоўцаў.

*(Курачук, С. Молодые специалисты от «А» до «Я» / С. Курачук // Кобрынскі веснік. – 2023. – 19 жніўня)*

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 3 85 81